# АДДАДЗІМ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА КАНДЫДАТАЎ БЛОКУ КАМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ!


ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 21 (1057) • Чацвер, 13 чэрвеня 1974 г. • Цана 2 кап. • Газета выходзіць з 1935 г.


**Дарагія таварышы! Цэнтральны Камітэт КПСС заклікае ўсіх грамадзян Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік у дзень выбараў у Вярхоўны Савет СССР аддаць свае галасы за кандыдатаў блоку камуністаў і беспартыйных. Ваша аднадушнае галасаванне з'явіцца новым яркім выражэннем адабрэння і падтрымкі ўнутранай і знешняй палітыкі партыі і Савецкай дзяржавы, рашучасці і надалей самааддана змагацца за ажыццяўленне велічных планаў камуністычнага будаўніцтва!**

## СУСТРЭЧА З ДЭПУТАТАМІ

Напярэдадні выбараў ва універсітэце адбылася сустрэча дэпутатаў Кастрычніцкага раёна з выбаршчыкамі—рабочымі і служачымі, супрацоўнікамі БДУ, студэнтамі інтэрната № 3.

Даць справаздачу аб выкананні сваіх дэпутацкіх абавязкаў прыйшлі прарэктар па навуковай рабоце БДУ Л. В. Валадзько, наладчык вытворча-тэхнічнага аб'яднання «Інтэграл» Б. Г. Шаметавец, майстар ГПТВ № 25 Н. С. Трафімава, студэнтка філалагічнага факультэта БДУ Л. Т. Агароднік.

Адкрыў сустрэчу намеснік загадчыка агіткалектыву М. М. Шумейка. Рабоце райвыканкома і Савета дэпутатаў працоўных Кастрычніцкага раёна, дасягненням прамысловасці, стану бытавога абслугоўвання насельніцтва было прысвечана выступленне Б. Г. Шаметаўца. Па жаданню выбаршчыкаў ён расказаў аб сваім жыццёвым шляху, аб працы ў ВТА.

Дэпутаты адказалі на пытанні прысутных. Выбаршчыкаў цікавілі тэрміны здачы ў эксплуатацыю некаторых будаўнічых аб'ектаў на тэрыторыі раёна.

У заключэнне былі паказаны дакументальныя фільмы.

**В. ПАПОЎСКІ.**

### ДА ДНЯ ВЫБАРАЎ

У калектыве бібліятэкі адбыўся сход, прысвечаны «Звароту Цэнтральнага Камітэта КПСС да ўсіх выбаршчыкаў, грамадзян СССР».

Выступіўшыя на сходзе супрацоўнікі бібліятэкі прывялі пераканаўчыя факты і прыклады, якія характарызуюць паступальнае развіццё розных бакоў нашага жыцця за перыяд ад выбараў да выбараў.

Асабліва пранікнёна прагучалі словы камсамолкі Святланы Панчанка, якая 16 чэрвеня ўпершыню будзе галасаваць за кандыдатаў блоку камуністаў і беспартыйных.

**Наш кар.**

## З ДНЁМ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СТАЛАСЦІ!

ДАРАГІ СЯБАР! Табе споўнілася 18 гадоў, і сёння наша слова да цябе.

Ты даўно адчуў сябе дарослым: на выпускным вечары, калі дырэктар школы ўручыў табе атэстат сталасці, у той дзень, калі майстар прывёў цябе на рабочае месца, калі атрымаў ты студэнцкі білет.

Але хутка ты яшчэ раз па-асабліваму адчуеш сваю грамадзянскую сталасць. Праз некалькі дзён адбудуцца выбары ў Вярхоўны Савет нашай краіны, і ты першы раз у жыцці прымеш у іх удзел.

За што ты будзеш галасаваць?

За палітыку нашай партыі, за чашу дзяржаву, за самы гуманны і прагрэсіўны лад, што даў табе права бясплатна вучыцца, лячыцца, адпачываць...

Аб табе ж па-бацькоўску клапоціцца Савецкая дзяржава. І вось за гэтую дзяржаву, за Савецкую ўладу, за самы прагрэсіўны грамадскі лад ты аддасі свой голас.

Ты ведаеш імёны кандыдатаў народа. Сярод іх людзі, якія адстойвалі Савецкую ўладу са зброяй у руках, самааддданыя працаўнікі палёў, рабочыя і інжынеры, вучоныя, урачы, настаўнікі, дзяржаўныя дзеячы. Але хто б яны ні былі, з дэпутацкімі абавязкамі на іх ускладваецца дадатковая вялікая праца — клопат аб людзях і аб табе.

— Мае бацькі — звычайныя калгаснікі, а вось я вучуся ва універсітэце, — гаворыць Марыя Шымко, студэнтка II курса факультэта журналістыкі. — Спачатку нават самой не верылася. Я ведаю, што толькі дзякуючы нашаму савецкаму ладу можа споўніцца мая мара —стаць журналісткай, быць у поўнай меры карыснай свайму народу, Радзіме. Таму я з нецярпеннем і хваляваннем чакаю дня выбараў.

У выбарах упершыню прымуць удзел і такія актывісты, выдатнікі вучобы, як Наташа Казлова, студэнтка I курса геаграфічнага факультэта, Вольга Зудава, Алег Бажэлка, Галя Малікіна з юрыдычнага факультэта, Саша Астроўскі з факультэта журналістыкі і многія, многія іншыя.

Дарагія сябры! Віншуем вас з надыходзячым святочным днём — днём вашай грамадзянскай сталасці!

*АД ВЫБАРАЎ ДА ВЫБАРАЎ*

## НАВАСЕЛЛІ НАШАЙ СТАЛІЦЫ

Яшчэ адзін новы адрас з'явіўся ў Мінску: вул. Пляханава, 85. Праз дзень-два з віншавальнымі тэлеграмамі сюды зачасцяць паштальёны, а пакуль што да вялікага дзевяціпавярховага дома адна за адной падыходзяць машыны з мэбляй і хатнімі рэчамі — едуць шчаслівыя навасельцы. 350 сем'яў мінчан атрымалі кватэры ў доме-прыгажуне.

Гэта зусім невялікая частка навасельляў, якія спраўляюць мінчане штомесяц. У выканкоме гарадскога Савета дэпутатаў працоўных карэспандэнту БЕЛТА паведамілі, што за апошнія тры гады больш чым 45 тысяч сем'яў атрымалі ў Мінску новыя добраўпарадкаваныя кватэры. За гэты час у сталіцы здадзена звыш двух з паловай мільёнаў квадратных метраў агульнай плошчы жылля.

У адпаведнасці з рашэннямі Кампартыі і ўрада рэспублікі выканкомамі гарадскога і раённых Саветаў дэпутатаў працоўных праведзена значная работа па паляпшэнню жыллёвых умоў інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, сем'яў загінуўшых воінаў, падпольшчыкаў і партызан. За апошнія сем гадоў 1.535 такіх сем'яў перасяліліся ў новыя добраўпарадкаваныя кватэры. Да канца гэтага паўгоддзя справяць наваселле яшчэ 576 сем'яў інвалідаў вайны, сем'яў загінуўшых воінаў, падпольшчыкаў і партызан, узятых на ўлік да лютага 1974 года.

Вялікія сродкі штогод выдзяляюцца дзяржавай на правядзенне капітальнага і бягучага рамонту жылых дамоў. За тры мінулыя гады ў горадзе капітальна адрамантаваны 502 жылыя дамы, на што выдаткавана каля 18 мільёнаў рублёў.

За гады дзевятай пяцігодкі ў горадзе будзе пабудавана звыш 4 мільёнаў квадратных метраў жылля — каля васьмідзесяці тысяч сем'яў атрымаюць новыя кватэры. А гэта значыць, што амаль усё насельніцтва даваеннага Мінска за пяць гадоў перасеіліцца ў новыя кватэры.

(БЕЛТА).

## З УСВЕДАМЛЕННЕМ ГОНАРУ І АДКАЗНАСЦІ

У жыцці чалавека адбываецца, вядома, шэраг этапаў. Яны—прыступкі, што вядуць да грамадска-палітычнай сталасці. Школа, піянерскі гальштук, камсамольская клятва... Нарэшце, надыходзіць перыяд, калі грамадства прызнае цябе зусім сфарміраваным чалавекам, даварае табе.

Гэта давер'е выяўляецца перш за ўсё ў тым, што табе Канстытуцыяй даецца права свабодна выказаць сваю волю.

16 чэрвеня гэтым правам упершыню буду карыстацца і я. Канешне, мяне не пакідае адчуванне вялікай адказнасці. Выбары — самая масавая, самая важная падзея ў нашай краіне. У ёй удзельнічае ўвесь савецкі народ. І мне прыемна ўсведамляць, што ў гэты дзень я, як часцінка савецкага грамадства, буду непасрэдна прымаць удзел у такой велізарнай справе.

**С. НІКІЦІНА,**
**студэнтка II курса юрфака.**





Вядома, што вучыцца студэнтам-вячэрнікам значна цяжэй, чым студэнтам стацыянара. І таму зразумела, што заканчэнне навучання для кожнага студэнта вячэрняга аддзялення — асабліва значная падзея!

Для Івана Шанчука, як і для ўсіх выпускнікоў-вячэрнікаў юрыдычнага факультэта, дзяржэкзамен — апошняе выпрабаванне перад заканчэннем вучобы.

Фота **Д. Чаховіча.**

### ПА ПАМЯТНЫХ МЯСЦІНАХ

У сувязі з 30-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў мясцком прыняў рашэнне арганізаваць шэраг паездак па месцах баявой славы рэспублікі — у Хатынь, на Курган Славы, у раёны, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны дыслакаваліся і дзейнічалі партызанскія брыгады.

Адна з такіх экскурсій —у Брэсцкую крэпасць-герой — адбылася ў мінулую нядзелю. Выкладчыкі і супрацоўнікі агульнауніверсітэцкіх кафедр наведалі музей крэпасці, агледзелі помнікі-манументы загінуўшым, пазнаёміліся са славутасцямі горада.

### ТРЫЦЦАЦІГОДДЗЮ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА



У канцы мая ў адным з маляўнічых куткоў непадалёку ад Маладзечна адбыўся злёт турыстаў Кастрычніцкага раёна г. Мінска. Ён быў прысвечан трыццацігоддзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Наша каманда складалася ў асноўным са студэнтаў фізічнага, гістарычнага і матэматычнага факультэтаў.

Злёт з'явіўся завяршаючым этапам аперацыі «Вызваленне», у якой студэнты нашага універсітэта ўдзельнічалі ўжо некалькі год. Іх работа была прысвечана вывучэнню гісторыі 50-й арміі II Беларускага фронту.

У гэтым годзе нашы турысты правялі шаснаццаць паходаў па месцах баёў гэтай арміі. Матэрыялы паходаў: дакументы, фотаздымкі, успаміны былі сабраны ў некалькі альбомаў. Іх разам са справаздачай аб выкананай рабоце па аперацыі «Вызваленне» і прадставілі студэнты.

Акрамя гэтага, турысты БДУ ўдзельнічалі ва ўсіх конкурсах: у турысцкім мнагабор'і, спартыўным арыентаванні, у конкурсах па афармленню лагера і на лепшае прыгатаванне абеду, у конкурсе насценных газет, нарэшце.

Турысты ёсць турысты. Днём —напружанне зменяючых адзін другога конкурсаў, а вечарам каля традыцыйнага кастра — песні.

У турысцкім мнагабор'і і ў арыентаванні турысты БДУ былі другімі. А пры падвядзенні агульных вынікаў занялі трэцяе месца.

**В. АНДРУХОВІЧ.**





# НА РОЗНЫХ МАРШРУТАХ

ВУЧЭБНЫЯ і вытворчыя практыкі на геаграфічным факультэце займаюць пятую частку вучэбнага часу студэнтаў. Паспяховае спалучэнне тэарэтычнай падрыхтоўкі з практыкамі, іх якасць і ўзаемасувязь у значнай ступені вызначаюць узровень падрыхтоўкі маладога спецыяліста.

Вучэбны план геаграфічнага факультэта складзен такім чынам, што на малодшых (I—II) курсах сканцэнтраваны ўсе вучэбныя практыкі, на III і IV курсах — вытворчыя.

Вучэбныя практыкі — па геадэзіі, метэаралогіі, глебазнаўству, геалогіі, геамарфалогіі, гідралогіі, батаніцы і комплексная геаграфічная — накіраваны на ўмацаванне шырокай геаграфічнай падрыхтоўкі студэнтаў, азнаямленне іх з асноўнымі метадамі палявых назіранняў і апрацоўкі вынікаў, а таксама яны прывіваюць навыкі комплекснага падыходу да ацэнкі прыродных з'яў.

З гэтага года на геаграфічнай станцыі «Заходняя Бярэзіна» плануюцца амаль усе вучэбныя практыкі. У летні перыяд на станцыі будуць працаваць адначасова да 350 студэнтаў і 40 выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

Дзякуючы будаўніцтву геастанцыі з'явілася магчымасць канцэнтрацыі ўсіх практык у адным месцы, распрацоўкі вучэбных праграм для канкрэтнай тэрыторыі. Стала больш цеснай узаемасувязь паміж асобнымі відамі практык.

Завяршаюцца вучэбныя практыкі трохтыднёвай комплекснай вучэбна-азнаямленчай практыкай па далёкіх маршрутах. Цяпер распрацавана і апрабавана пяць маршрутаў: Каўказскі, Карпацкі, Прыдняпроўскі, Уральскі і Паўночны. У час далёкіх падарожжаў студэнты вывучаюць прыродныя ўмовы і эканоміку розных зон тэрыторыі Савецкага Саюза ад тундры да субтропікаў.



У перыяд вучэбных практык студэнты сумяшчаюць вучобу з работай на будаўніцтве новых карпусоў геастанцыі, а таксама дапамагаюць суседнім калгасам ва ўборцы ўраджаю.

Вялікую дапамогу ў арганізацыі ўсіх работ у час палявой практыкі аказваюць спецыяльныя студэнцкія камісіі: працоўных спраў, па харчаванню, жыллёва-бытавая, спартыўная і іншыя, у састаў якіх уваходзяць лепшыя студэнты курса.

Штогод перад выездам студэнтаў на практыку партыйнае бюро факультэта зацвярджае план палітыка-выхаваўчай работы гэтага адказнага перыяду.

Студэнты III і IV курсаў стацыянара і V курса вячэрняга аддзялення і завочнага факультэта праходзяць вытворчую практыку ў базавых арганізацыях і ўстановах — інстытуце глебазнаўства і аграхіміі МСГ БССР, упраўленні гідраметслужбы, упраўленні геалогіі пры Савеце Міністраў БССР, Белгіпраземе, Гіправодгасе, інстытутах АН БССР і іншых. У гэтым годзе вялікая група студэнтаў эканаміка-географаў накіруецца ў Дзяржкамітэт па выкарыстанню працоўных рэсурсаў БССР.

Вялікую работу праводзяць студэнты ў саставе экспедыцый праблемнай лабараторыі меліярацыі ландшафтаў, лабараторыі возеразнаўства, кафедры фізічнай геаграфіі СССР.

Вялікая ўвага ўдзяляецца грамадска-палітычнай практыцы. На кафедрах складзен пералік лекцый і дакладаў, якія ўключаюцца ў індывідуальныя заданні студэнтаў. У гэтым годзе большасць прапанаваных тэм прысвечана 30-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Штогод група студэнтаў праходзіць практыку ў Балгарыі. У гэтым годзе туды накіроўваюцца студэнты III курса.

Пройдзе некалькі дзён, і апусцеюць аўдыторыі і кабінеты факультэта. Студэнты-географы накіруюцца па розных маршрутах для вывучэння асаблівасцей прыроды, для пазнання яе бясконцых таямніц.

**В. АНОШКА,**
**кіраўнік практык.**

**⊙ Мензульную здымку вядуць студэнты-географы II курса завочнага факультэта.**

**⊙ Падвядзенне вынікаў геадэзічнай практыкі.**

**⊙ Дацэнт Б. А. Мядзведзеў вядзе практыку па геадэзіі.**



**НОВЫЯ ЭКСПАЗІЦЫІ**

## І МАНЕТЫ ГАВОРАЦЬ...

Можна паслухаць лекцыю, прачытаць падручнік і канспект і, здавалася б, дастаткова добра засвоіць гэты невялікі, але на дзіва важны для будучага гісторыка курс нумізматыкі. А лепш убачыць гэтыя дайшоўшыя да нас з глыбокай старажытнасці, сярэднявяковыя і больш позніх эпох помнікі — манеты. Аб іх паінфармаваны чалавек можа расказаць многа захапляючых гісторый.

Цяпер ва універсітэцкім музеі завершаны асноўныя работы ў аддзеле нумізматыкі — падрыхтавана першая частка нумізматычнай выстаўкі, на якой прадстаўлена каля 1.000 арыгінальных медных, сярэбраных, залатых манет. Узрост старэйшых з іх дасягае дзвюх з паловай тысяч год.

Тут добра прадстаўлены манеты Старажытнай Грэцыі, Антычнага Прычарнамор'я, Рыма — перыяду рэспублікі і імперыі, Ірана, краін Арабскага Халіфата, Візантыі, Старажытнай Русі, Сярэдневяковай Англіі, Германіі, Венгрыі, Польшчы, Францыі, Чэхіі, Залатой Арды, краін Прыбалтыкі, Аўстрыйскай імперыі, узоры айчынных манет перыяду ад Івана Грознага да Пятра I.

Падобная выстаўка — унікальная з'ява ў вузаўскім музеі. Экспазіцыя яе будуецца ў адпаведнасці з праграмай лекцыйнага курса па нумізматыцы Беларусі. Дарэчы, гэта дысцыпліна чытаецца пакуль толькі ў трох універсітэтах Саюза — Маскоўскім, Ленінградскім і нашым. І зусім зразумелыя тыя турботы і клопат, што праяўляе аб новай экспазіцыі нядаўна створаная ў БДУ кафедра археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін.

Пасля завяршэння работ у гэтым аддзеле музея дзякуючы дыяпазітывам, маляўнічым мініяцюрам, якія тут з'явяцца, бачна прадстануць далёкія эпохі. Больш нагляднай стане і неўміручасць гэтых своеасаблівых помнікаў. Бо да гэтага дня нетры нашай рэспублікі шчодра дзеляцца таямніцамі і штогод дораць даследчыкам 10—15 скарбаў.

Невышадкова таму другая частка экспазіцыі задумана як скарбніца, дзе ў натуральным абрамленні будуць выстаўлены найбольш цікавыя скарбы.

Увогуле ўсё павінна быць вельмі цікава. І ўжо ў першым семестры новага навучальнага года аддзел нумізматыкі пачне працаваць, паглыбляючы веды студэнтаў, узбагачаючы наведвальнікаў музея вечнымі каштоўнасцямі сусветнай культуры.

**А. АЛЕНІЧ.**

## ПАВЫШАЦЬ ДЗЕЙСНАСЦЬ ГНК

На справаздачна-выбарнай канферэнцыі народных кантралёраў універсітэта аб групе народнага кантролю фізфака мінулага саставу і яе кіраўніку Н. М. Хаўратовіч было сказана шмат добрых слоў. Дэкан факультэта І. П. Зяцькоў дзякаваў групе за вялікую дапамогу ў вучэбнай рабоце. навядзенні парадку ў інтэрнаце. У справядлівасці высокай ацэнкі работы групы мы пераканаліся пры перадачы спраў, якая пачалася на сумесным пасяджэнні старога і новага саставаў. На гэтым пасяджэнні ў прысутнасці прадстаўніка адміністрацыйна - гаспадарчай часткі разглядалася пытанне «Аб мерапрыемствах па абсталяванню інтэрната і паляпшэнню быту студэнтаў». Такі сумесны падрабязны разбор спраў у інтэрнаце № 7 у многім дапамог новаму саставу ГНК паскорыць рашэнне праблем рамонту і абсталявання інтэрната.

Вялікую работу па паляпшэнню быту студэнтаў праводзяць намеснік старшыні ГНК старшы выкладчык Г. І. Пятровіч і кіраўнік сектара матэрыяльна-бытавога забеспячэння асістэнт С. А. Ракун. Сектар узяў пад кантроль работу буфетаў у радыёфізічным корпусе і сталовай інтэрната № 7.

Многа добрых пачынанняў у сектара вучэбнай работы, якім кіруе дацэнт В. П. Дабрэга. Галоўны напрамак яго дзейнасці — стан планавання вучэбнага працэсу. Сектар правёў праверкі выкарыстання кафедрамі тэхнічных сродкаў навучання, па выніках вытворчай і грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў V курса, падрыхтаванасці кафедр да правядзення атэстацыі студэнтаў.

Сектар навуковай работы (кіраўнік дацэнт Г. М. Волахаў) вядзе кантроль за эфектыўнасцю навукова-даследчых работ кафедр. На пасяджэнні ГНК разгледжаны вынікі праверак актуальнасці тэматыкі НДР і ўкаранення іх у народную гаспадарку. У цяперашні час сектар разглядае фактычны ўдзел выкладчыкаў і студэнтаў у выкананні гаспадарча-дагаворных работ, правярае, наколькі тэмы НДР кафедр супадаюць з тэмамі чытаемых спецкурсаў. Усе матэрыялы праверак рэгулярна вывешваюцца на дошцы інфармацыі ГНК.

Побач з пэўнымі поспехамі ёсць і нявырашаныя пытанні. Асноўнае з іх — усё яшчэ нізкі каэфіцыент карыснага дзеяння. Частка праверак замыкаецца на самой групе і таму не з'яўляецца эфектыўнай. Да кантрольных праверак не прыцягваюцца буйныя спецыялісты, здольныя даць аб'ектыўную ацэнку правераным участкам работы. Такую памылку мы дапусцілі пры праверцы актуальнасці тэматык НДР і ўкараненні НДР у народную гаспадарку на кафедрах электрафізікі, радыёфізікі і электронікі ЗВЧ. У ходзе работы па гэтаму пытанню групай народнага кантролю не прыцягваліся члены вучонага савета факультэта, прафесары, вопытныя дацэнты, што вельмі знізіла якасць зробленага.

Па найбольш важных пытаннях вучэбнай і навуковай дзейнасці і быту запланаваны ў гэтым годзе паўторныя праверкі, якія, напэўна, дадуць лепшыя вынікі, бо ёсць ужо вопыт рашэння канкрэтных задач.

Вялікія надзеі ў набыцці неабходных ведаў і вопыту мы ўскладаем на універсітэцкую школу народных кантралёраў. Нам здаецца мэтазгодным, каб на занятках школы выступілі кіраўнікі асноўных універсітэцкіх службаў — навуковай, вучэбнай, адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, — якія б асвятлілі тыя пытанні і задачы, якія рашаюцца кожнай службай у маштабе універсітэта.

Залог павышэння дзейснасці народнага кантролю мы бачым перш за ўсё ў цесным кантакце з партыйнай арганізацыяй факультэта, дэканатам, а таксама з камсамольскай і прафсаюзнай арганізацыямі.

**А. СЕРАФІМОВІЧ.**

## УСЕСАЮЗНАЯ МЕТАДЫЧНАЯ

На ФПМ прайшла метадычная нарада выкладчыкаў, якія вядуць заняткі па курсах «Метады аптымізацыі» і «Тэорыя ігр; даследаванне аперацый». Арганізаваная Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, яна ставіла мэтай абмеркаваць стан выкладання гэтых курсаў у ВНУ краіны.

— У нарадзе, — расказвае доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар кафедры метадаў аптымальнага кіравання ФПМ БДУ Р. Ф. Габасаў, — прынялі ўдзел 58 чалавек з 29 ВНУ краіны.

Быў абагульнен вопыт выкладання, выпрацаваны рэкамендацыі з мэтай збліжэння тэорыі з практыкай, паляпшэння стану метадычнай работы.

## У ВНУ КРАІНЫ

На кафедры археалогіі гістарычнага факультэта МГУ праходзіла юбілейная XX Усесаюзная археалагічная студэнцкая канферэнцыя (УАСК). У ёй прынялі ўдзел дэлегаты больш чым 60 вну. Скліканню XX УАСК папярэднічалі рэгіянальныя студэнцкія канферэнцыі. Даклады, зробленыя на іх, былі рэкамендаваны на УАСК. Тэматыка іх шырокая: праблемы першабытнай і славяна-рускай, антычнай і ўсходняй археалогіі, пытанні методыкі археалагічных даследаванняў.

«Московский университет».

### АДАМУ МІЦКЕВІЧУ ПРЫСВЯЧАЛАСЯ

Няма нічога дзіўнага ў тым, што у сценах філалагічнага факультэта гучыць замежная мова. Так было і на чарговай «Славянскай пятніцы». На гэты раз «пятніца» была прысвечана творчасці вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча. Студэнты польскага аддзялення расказалі ў сваіх дакладах аб жыццёвым і творчым шляху паэта, прачыталі на польскай мове і у рускім перакладзе вершы Міцкевіча, урыўкі з паэм і драматычных твораў.

У правядзенні вечара паэзіі Міцкевіча ўдзельнічалі не толькі студэнты-паланісты, але і студэнты з ПНР, якія навучаюцца на рускім аддзяленні філалагічнага факультэта.

Вялікую дапамогу ў арганізацыі вечара аказаў выкладчык з Кракаўскага універсітэта магістр Ян Гадынь.

«Ленинградский университет».

### УЗНАГАРОДА САВЕЦКАГА ФОНДУ МІРУ

За актыўны ўдзел у арганізацыі работы па прапагандзе мэт і задач Савецкага фонду міру і папаўненне яго добраахвотнымі укладамі ў інтарэсах умацавання усеагульнага міру. свабоды і бяспекі народаў шэраг калектываў і актывістаў руху прыхільнікаў міру Кіраўскага раёна Саратава адзначан узнагародамі. Сярод іх — старшыня раённай камісіі садзеяння Фонду міру доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Саратаўскага універсітэта Н. П. Купцоў, які ўзнагароджан ганаровым жэтонам Савецкага фонду міру.

«Ленинский путь».

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

# ПСІХОЛАГ І ПЕДАГОГ

Мінск яшчэ быў акупіраван, а на падмаскоўнай станцыі Сходня ўзнавіў работу Беларускі дзяржаўны універсітэт. Сюды па спецыяльнаму запрашэнню прыехала дацэнт Алена Паўлаўна Ерась.

Эрудыцыя, высокая патрабавальнасць да сябе і сяброў, уменне працаваць у цяжкіх умовах, дысцыплінаванасць і адказнасць— гэтыя якасці новага выкладчыка адразу ж прыцягнулі ўвагу і студэнтаў, і калег. Яна хутка стала паважаным і аўтарытэтным членам калектыву.

Гэтаму, вядома, у многім садзейнічала школа жыцця, якую да таго часу паспела прайсці Алена Паўлаўна: работа настаўніцай, загадчыцай райана, удзел у будаўніцтве Магніткі, куды камсамолка накіравалася добраахвотна. З рабочай Магніткай звязан і пачатак навуковай дзейнасці. Яна была камандзіравана ў аспірантуру, пасля сканчэння якой у 1937 годзе паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю.

З красавіка 1944 года нязменна, на працягу амаль трыццаці год, да выхаду на пенсію Алена Паўлаўна — за кафедрай універсітэта. Яе бездакорныя лекцыі не проста захаплялі студэнтаў. Многім і многім яны дапамаглі пацвердзіць правільнасць выбару прафесіі, жыццёвага шляху. Кожны слухач атрымаў ад Алены Паўлаўны неацэнны багаж ведаў па псіхалогіі, такіх неабходных у педагагічнай рабоце.

Вялікі ўклад унесла Алена Паўлаўна ў падрыхтоўку кадраў псіхолагаў. Загадваючы аддзяленнем логікі і псіхалогіі, а потым працягваючы гэтую работу на філалагічным, філасофскім і іншых факультэтах, яна фарміравала ў студэнтаў любоў да псіхалогіі, узбройвала будучых спецыялістаў не толькі ведамі, але і методыкай навуковага даследавання, уменнямі назіраць, эксперыментаваць. Цяпер няма ў рэспубліцы такога раёна, дзе б не працавалі, выхаванцы А. П. Ерась. Многія з іх сталі кандыдатамі навук, дацэнтамі, распрацоўваюць праблемы псіхалогіі і педагогікі, філасофіі і навуковага камунізму.

А. П. Ерась — вядомы савецкі вучоны-псіхолаг. Яе пяру належыць звыш 30 буйных навуковых работ па пытаннях агульнай і педагагічнай псіхалогіі.

Асобае месца сярод іх займаюць работы, прысвечаныя праблемам тэмпераменту. Яшчэ аспіранткай Алена Паўлаўна бліскуча выканала дысертацыйную работу «Даследаванне тэмпераментаў школьнікаў», у якой упершыню ў савецкай псіхалогіі была асветлена гісторыя развіцця вучэння аб тэмпераментах і распрацавана методыка вывучэння тэмпераментных адрозненняў у школьнікаў. Невыпадкова менавіта А. П. Ерась было даручана напісаць раздзел пра тэмперамент у падручнік па псіхалогіі, выдадзены ў 1939 годзе ў Маскве, які атрымаў усеагульнае прызнанне. Пазней аналагічны раздзел Алена Паўлаўна напісала і для падручніка псіхалогіі, выдадзенага ў Мінску, а затым апублікавала серыю кніг і брашур, напісаных спецыяльна для настаўнікаў. Многія з іх пасля апублікавання ў Мінску перавыдаваліся ў Маскве, а некаторыя перакладзены на замежныя мовы.

З імем А. П. Ерась звязана стварэнне ў Беларусі рэспубліканскага Таварыства псіхолагаў.

Як палымянага прапагандыста псіхалагічных ведаў яе часта можна сустрэць у школах, заводскіх цэхах, маладзёжных клубах. На працягу ўжо многіх год яна актыўна супрацоўнічае ў таварыствах «Веды», «Дружба»; 16 год была дэпутатам Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных.

Адзначаючы сямідзесяцігоддзе Алены Паўлаўны Ерась, псіхолагі і педагогі рэспублікі жадаюць ёй добрага здароўя, поспехаў у навуковай і грамадскай дзейнасці.

**Р. ВАДЭЙКА,**
**М. КЛЯЎЧЭНЯ,**
**кандыдаты псіхалагічных навук.**
**А. РЫЧАГОЎ,**
**кандыдат педагагічных навук.**

### ВЫСТАЎКА Ў БІБЛІЯТЭЦЫ

«Самая дэмакратычная ў свеце» — так называецца тэматычная выстаўка літаратуры—кніг, брашур, артыкулаў з часопісаў і газет,—якая арганізавана ў бібліятэцы БДУ да выбараў у Вярхоўны Савет СССР.

Чытачы могуць знайсці тут багаты матэрыял аб савецкай выбарчай сістэме, аб адносінах дэпутата і выбаршчыкаў, цікавыя факты для параўнання дзвюх дэмакратый—савецкай і буржуазнай.



Пакуль яшчэ ўспамінамі аб мінулым леце жывуць байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Але ўжо менш чым праз тры тыдні апранецца студэнцтва ў форму і на два месяцы забудуцца залікоўкі і канспекты, падручнікі і аўтаручкі зменяцца на будаўнічыя прылады.

# АБАПІРАЮЧЫСЯ НА ТРАДЫЦЫІ

Атрад «Расінка» параўнальна малады. Ён быў сфарміраван на базе дзвюх груп I курса матфака ў 1973 годзе. Прынцып такой арганізацыйнай пабудовы апраўдаў сябе адразу і дазволіў цясней згуртаваць калектыў, закласці добрыя традыцыі. Сярод іх належыць адзначыць актыўнасць байцоў атрада ў культурна-масавай дзейнасці. Адзначым, што з 26 чалавек старога саставу 18 прымалі ўдзел у канцэртах, з якімі атрад выступаў на камбінаце дэкаратыўнага садоўніцтва, у вёсцы Бервішчы Уздзенскага раёна, у клубе аб'яднання «Прамень».

У гэтым годзе атрад выязджае ў Малдавію. Байцоў стала больш 50 чалавек, але прынцып пастраення застаўся такім жа. Павелічэнне колькасці байцоў стварыла новыя магчымасці ў арганізацыі культурна-масавай работы. За падрыхтоўчы перыяд атрад даў тры канцэрты: у інтэрнаце № 7 БДУ, у інтэрнаце завода імя Кірава, у СШ № 44 г. Мінска. Байцы ўдзельнічалі таксама ў аглядзе-конкурсе малдаўскіх атрадаў БДУ. Першы канцэрт быў прысвечан дню нараджэння камсамольскай арганізацыі. Перад канцэртам з цікавымі ўспамінамі аб камсамольцах 20-х гадоў выступіла дацэнт А. Н. Нахімоўская. Выступленне нашай агітбрыгады было цёпла сустрэта студэнтамі. Закончыўся канцэрт выкананнем камсамольскіх песень.

Другі канцэрт быў прысвечан 50-годдзю з дня прысваення камсамолу імя У. І. Леніна. Даклад аб камсамоле зрабіла студэнтка дзевятай групы Н. Багатырова. Канцэрт прайшоў вельмі цікава. Невялікая зала была перапоўнена. На імправізаванай сцэне самадзейныя артысты паказалі сваё майстэрства і ў песнях, і ў танцах. В. Дубоўскі паказаў пантамімічныя эцюды. Цёпла было сустрэта выступленне квартэта «Расінка», які выконваў беларускія народныя песні. Заўзята выканалі венгерскі танец дзяўчаты. Актыўна ўдзельнічалі ў канцэрце І. Соскін, Е. Кузняцова, С. Гагарака, М. Тойшава, Т. Вакульчык, І. Васільеў, В. Ермакова і іншыя. Па просьбе рабочых быў арганізаван вечар адпачынку.

Цесныя сувязі ўстанаўліваюцца паміж байцамі нашага атрада і школай № 44. Рабяты правялі некалькі гутарак аб студэнцкім жыцці, выступілі з канцэртамі, наладзілі «Агеньчык». Рыхтуючыся да выезду ў Малдавію, агітбрыгада праяўляе вялікі клопат аб рэпертуары, імкнецца папоўніць яго песнямі і танцамі народаў СССР. Квартэт «Расінка» асновай рэпертуару выбраў беларускія, рускія і украінскія народныя песні. Плануецца стварыць хор з удзелам 20—25 чалавек, драмгрупу, танцавальны калектыў.

Здольных рабят многа, трэба толькі натхніць іх. Спадзяемся, што новыя байцы атрада не адстануць ад «ветэранаў» і добрыя традыцыі СБА яшчэ больш умацуюцца.

Мы прыкладзем усе намаганні да таго, каб было што паказаць у Малдавіі, і, думаем, рэпертуар агітбрыгады значна папоўніцца песнямі і танцамі брацкага малдаўскага народа.

Але мы не забываем, што асноўная наша задача — добрасумленна працаваць там, куды нас накіруюць. «Расінка» выклікана на спаборніцтва атрадам «Дружба народаў» ФПМ, і мы пастараемся не страціць гонар матфака.

**В. ЛУК'ЯНІЦА.**

ПРАЦЯГВАЕМ РАЗМОВУ

*КАЛЕКТЫЎ І Я*

# ДЗЕ МЯЖА НЕПАЎТОРНАСЦІ...

- ВЫНІКІ БЕСКАНТРОЛЬНАСЦІ
- РЫТМ ЖЫЦЦЯ
- АСАБІСТЫ ЭКСПЕРЫМЕНТ
- ЯК БЫЦЬ З КАХАННЕМ!

НЕ ВЕДАЮ, як вы паставіцеся да майго артыкула, ды гэта і не самае важнае. Справа ў тым, што цікавае і шматграннае студэнцкае жыццё — гэта працяглая і напружаная разумовая праца. Лекцыі, практычныя заняткі, навуковыя гурткі, рамантычная летняя практыка — вось далёка не поўны пералік таго, што адрознівае студэнцтва ад школярства. Але галоўнае — адносная самастойнасць. А яна вельмі розная ў кожнага з нас. Гэта асабліва датычыць свабоднага ад лекцый і практычных заняткаў часу. Злоўжыванне такой самастойнасцю, бескантрольнасць нярэдка выводзяць студэнта са строю.

Для таго, каб лепш зразумець гэта, варта ўзяць канкрэтны прыклад.

...Хлопцы-студэнты маладыя. Таму цяжка займацца толькі вучобай. З нецярплівасцю чакаюць яны, калі скончацца заняткі. Нарэшце надышло доўгачаканае шчасце: заняткі скончыліся. Прыходзяць мае таварышы дадому а пятай гадзіне вечара. Кладуцца спаць. Праз тры-чатыры гадзіны нашы хлопцы задумалі схадзіць у кіно ці да дзяўчат. Усе трое зніклі, як і не было. Засталіся ў пакоі толькі двое: я і мой таварыш. Пачыталі, павячэралі. Дванаццатая гадзіна вечара! Вочы пачынаюць раз-пораз зліпацца, і мы кладземся спаць. Заўтра першая пара ёсць. Я хутка задрамаў, пачаў сніцца вельмі прыемны сон. Невядома, колькі я насніў, але прыемнасці хутка надышоў канец. Аднекуль раздаўся моцны тупат, рэзкія крыкі і яшчэ нешта незразумелае. Расплюшчыў вочы: нада мной хлопцы. І што асабліва брыдка — адзін з іх над самым вухам брынчыць гітарай і заводзіць не сваім голасам нейкую незразумелую песню...

Назаўтра нашы хлопцы праспалі першую пару. Цяжка, вельмі цяжка падымацца, але нічога не зробіш. Другая пара — практычныя заняткі, а прапускаць іх нельга: усё роўна трэба будзе адпрацаваць у свабодны час. Зноў скончыліся заняткі. Што рабілі мае таварышы цяпер? Спалі? Не, цяпер было зусім іншае. Хлопцам прыйшла ў галаву ідэя: пагуляць у азартную гульню. Можа было б і не так, але ліха прыгнала сюды жыхароў з іншага пакоя. І як жа не пагуляць у такой вясёлай кампаніі! Гульня пачалася даволі спакойна, затым стала спорыцца, а яшчэ пазней — запалала магутным полымем. Ігракі знаходзіліся ў стане крайняга ўзбуджэння. Бесперапынна неслася злосная лаянка. Здавалася, хутка пойдуць у ход кулакі.

Нарэшце нашы ігракі ўспомнілі, што заўтра семінар. Узялі падручнікі і пайшлі ў чытальную залу. Вярнуліся адтуль у тры гадзіны ночы. Сёе-тое перакусіўшы, паваліліся ў ложак.

Назаўтра сяк-так падняліся хлопцы. Але на семінары ўсё, пра што гаварылася, у адно вуха ўлятала, а з другога вылятала. А на наступнай лекцыі яны мірна драмалі, як пшаніцу прадаўшы.

На трэці дзень хлопцы вырашылі класціся спаць у дваццаць тры нуль-нуль. Але па шэрагу прычын ляглі пазней. Выключылі святло. Каля дзвюх мінут стаяла мёртвая цішыня. Раптам у аднаго ўзнікла «ідэя» расказаць анекдот. І пайшло...

І гэтак кожны дзень. Вось такі мікракалектыў у інтэрнаце, мабыць, не адзіны.

Падобнае жыццё шкоднае тым, што нярэдка робіць студэнта слабавольным, рабом самых выпадковых прычын, ды яшчэ і падрывае здароўе.

Узнікае пытанне: у чым тут справа? Чаго ж не хапае? А не хапае таго, што мы называем рэжымам. Аб значэнні рэжыму напісана літаратуры больш чым дастаткова, таму падрабязна гаварыць не буду. Варта толькі запомніць, што рытм трымае зоркі на небе, рытмічна змяняюцца поры года, дні і ночы. Рытмічна скарачаецца сэрца і дыхальная мускулатура, дзякуючы чаму мы можам жыць, бо работа сэрца і лёгкіх — гэта чаргаванне іх працы і адпачынку.

Хто ж вінават у тым, што мы часта жывем не па рэжыму? Без перабольшання можна сказаць, што часцей—мы самі. Адсутнасць сілы волі, самаабмежавання і няўменне правільна ацэньваць канкрэтныя абставіны.

Вядома, часу ў студэнтаў мала. Чалавецтва яшчэ не навучылася кіраваць сваім часам, а таму выхад адзін — рацыянальна карыстацца ім. І ўся бяда, што мы гэтага рабіць не ўмеем.

З першых студэнцкіх гадоў браўся і я за гэту справу, але нічога не атрымлівалася. А ў гэтым годзе атрымалася. Я распрацаваў рэжым дня з улікам не выпадковых прычын, а канкрэтных умоў.

Што ўяўляе сабой гэты рэжым? Перш за ўсё, ён даволі аднастайны, бо кожны дзень заняткі пачынаюцца ў 8-30, а канчаюцца ў 15-35. Адпаведна з гэтым я падымаюся ў 7 гадзін. Раблю дыхальную гімнастыку пры адчыненай фортачцы, пасля яе — халодная водная працэдура. Хаджу на заняткі абавязкова пехатой. Гэта, па-першае, вельмі прыемна, па-другое—добрая размінка на свежым паветры, па-трэцяе—эканомія сродкаў. Пасля заняткаў — уборка пакоя (калі я дзяжурны).

Не прапускаю палітінфармацыі, гурткі, кіналекторый і г. д. Затым — прагулка, самападрыхтоўка з абавязковым перапынкам, у час якога раблю дыхальную комплексна-гантэльную гімнастыку. Пасля ўсяго гэтага — вячэра, вольны час і абавязковая прагулка перад сном. Грубых парушэнняў рэжыму амаль не бывае, а калі і бываюць, дык толькі ў выхадныя дні.

Сам рэжым мне вельмі падабаецца, і ўжо бачны некаторыя зрухі. Устаю заўсёды бадзёрым, заняткі сустракаю з радасцю, з'явілася непавага да такіх дзён, калі няма чым заняцца. Прагулкі і фіззарадкі сталі для мяне такой неабходнасцю, як неабходнасць дыхаць.

Вядома, у вас могуць з'явіцца пярэчанні. Іншы можа сказаць, што калі, маўляў, буду жыць па раскладу, дык не хопіць часу на каханне. Па-праўдзе сказаць — хопіць. Я, напрыклад, супраць такога кахання, калі да самай раніцы каханыя стаяць на лесвічных пляцоўках або ў нішах. Студэнту трэба вучыцца, а каб вучыцца паўнацэнна, патрэбен і паўнацэнны сон. Вучоба — гэта будучы хлеб, а сон—выратавальнік нервовай сістэмы. Трата ж начэй у нішах — зусім не паказчык трывалага і вечнага кахання. Кахаць трэба таксама з розумам.

Галоўнае для студэнта — гэта паспяхова закончыць сваю пяцігодку, уладкавацца на работу, зберагчы здароўе. А калі будзе гэта, то будзе і каханне. Самае найлепшае — правільна і спакойна жыць, любіць разумовую і фізічную працу, не быць рабом блакітнага і зялёнага «зміяў», тады і жыццё будзе прыгожым калі не сёння, дык заўтра.

**А. ЯРМОЛЬЧЫК,**
**студэнт IV курса біяфака.**

